УДК 28-67:930.85(476)

*М. А. Татарэвіч*

# Культурна-гістарычны кантэкст адаптацыі мусульман на беларускіх землях

*У артыкуле ўмоўна адзначаны і прааналізаваны асноўныя перыяды сацыякультурнай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі, падагулены вопыт іх узаемадзеяння з беларусамі. Аўтар звяртае ўвагу на культурна-гістарычны кантэкст адаптацыі мусульман да сацыякультурнай прасторы Беларусі, выяўляе яе формы і адметныя элементы, якія, засвойваючыся ў розных каштоўнасных сістэмах, здольны захаваць уласную самабытнасць.*

Канец XX – пачатак XXI ст. характарызуецца кардынальнымі палітычнымі і эканамічнымі зменамі ў еўрапейскай супольнасці, якія прывялі па С. Хантынгтану да «сутыкнення цывілізацый». Адкрыццё меж паміж Усходам і Захадам абумовіла новы этап міграцыйных патокаў і стала прычынай шэрагу праблем, звязаных з працэсам адаптацыі носьбітаў мусульманскай традыцыі ў грамадства, якое прымае. Гэты працэс істотна ўплывае на сацыяльна-палітычную і рэлігійную сітуацыю ў Еўропе, робіць актуальным пытанне аб хрысціянска-мусульманскім дыялогу. Ісламскае веравызнанне ў пачатку XXI ст. стала найбольш распаўсюджаным. Улічваючы той факт, што ўзмацнілася актыўнасць ісламскіх тэрарыстычных арганізацый, а пэўная частка паспяхова адаптавалася ў сацыякультурную прастору Захаду, застаюцца актуальнымі праблемы ўзаемапаразумення паміж людзьмі розных культур, традыцый, узнікае неабходнасць тэарэтычнага асэнсавання спецыфікі дадзенага працэсу і пошуку практычных мер для пераадолення міжнацыянальнай варожасці.

Рэспубліка Беларусь з’яўляецца шматнацыянальнай дзяржавай. Гісторыя ўзаемаадносін паміж народамі, якія насяляюць беларускія землі, мае шматгадовы вопыт сумеснага пражывання, што прывяло да ўзаемапранікнення культурных традыцый.

Такім чынам, неабходнасць даследавання развіцця многаэтнічнай і поліканфесійнай беларускай культуры, вывучэнне мінулага асобных этнасаў Рэспублікі Беларусь скіравана на ўдакладненне ведаў аб гісторыка-культурным працэсе і выяўленне спецыфікі фарміравання нацыянальнай культуры.

Важнай часткай беларускай нацыянальнай культуры з’яўляюцца традыцыі мусульманскай супольнасці. Захаванне і развіццё яе культуры і духоўнасці дазваляе мусульманам камфортна існаваць у беларускім талерантным грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння на фоне палітызацыі рэлігійных праблем мусульмане часта ацэньваюцца як «канфліктная» супольнасць, але ў айчыннай гісторыі вядомы вопыт паспяховай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі ў сацыякультурную прастору Беларусі. Дадзены вопыт сёння мае патрэбу ў вывучэнні, абагульненні і практычным прымяненні, што надае праблеме агульнадзяржаўную значнасць.

Аналіз тэарэтычных даследаванняў па гісторыі і культуры беларускіх мусульман сведчыць аб устойлівай цікавасці айчынных, польскіх, расійскіх і літоўскіх навукоўцаў да вывучэння іх супольнасці (С. Дубянецкі [1], С. В. Думін і І. Б. Канапацкі [2], З. І. Канапацкая [4], А. І. Смолік [3] і інш.). Разгледжаная літаратура дазваляе вызначыць асноўныя кірункі ў вывучэнні дадзенай праблемы: сацыяльнае становішча беларускіх мусульман, мячэць як цэнтр захавання і трансляцыі іх культуры, традыцыйна-абрадавая і побытавая культура, дзейнасць грамадска-культурных арганізацый, а таксама сутнасць і адметнасць іх адаптацыі ў Беларусі. Праведзены аналіз дае магчымасць звярнуць увагу на тое, што праблема мусульман у Беларусі разглядаецца ў рэчышчы гістарычнай, этналагічнай, сацыялагічнай парадыгм, аднак комплексных культуралагічных даследаванняў няма.

Трактуючы паняцце «носьбіты мусульманскай культурнай традыцыі», будзем разглядаць мусульман як адзіны соцыум без удакладнення этнічнай і моўнай прыналежнасці. Мусульманскія народы, якія гістарычна пражывалі на тэрыторыі Беларусі, былі этнічна разнастайнымі, адрозніваліся ўкладам жыцця, сацыяльнай структурай, культурнымі традыцыямі. Нягледзячы на тое, што першымі носьбітамі мусульманскай культурнай традыцыі на беларускіх землях былі татары, а пасля – азербайджанцы і этнасы Сярэдняй Азіі, мы зыходзім з таго, што іх мова і этнічная прыналежнасць для вызначэння ідэнтычнасці не гэтак важныя, як рэлігія.

Кожны этнас мае свае адметныя геаграфічныя і канкрэтна-гістарычныя ўмовы фарміравання. Адрозненне этнасаў – гэта адрозненне іх культур, якія з'яўляюцца ўніверсальным механізмам адаптацыі супольнасцей як да прыроднага, так і да сацыяльнага асяроддзя свайго існавання дзякуючы запазычанням і рэарганізацыі. У сувязі са зменамі ўмоў жыцця традыцыйныя формы часта разбураюцца і забываюцца. Тады ўзнікаюць і даюць аб сабе знаць новыя патрэбы і, адпаведна, прыстасаваныя да іх новыя культурныя механізмы. Культура па сваёй сутнасці інтэгратыўная. Будучы адным з прадуктаў працэсу адаптацыі, элементы дадзенай культуры маюць тэндэнцыю ўтвараць узгодненае і інтэгратыўнае цэлае.

На тэарэтычным узроўні праблемы міжкультурных кантактаў пачалі асэнсоўвацца ў першай чвэрці XX ст., узрасла навуковая цікавасць да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследавання ўмоў і праходжання самога працэсу міжкультурнай адаптацыі (Р. Лінтан [13], Р. Рэдфілд [14], М. Херсковіц [10]). Праблематыка сацыяльнай адаптацыі распрацоўвалася ў працах Г. Тарда [7], Р. Парка [11], Т. Парсанса [12], П. Сарокіна [6]. Пытанні сацыякультурнай адаптацыі вывучалі С. Бочнер [9] і А. Фернхем [8].

*Сацыякультурная адаптацыя* па сваёй сутнасці з'яўляецца працэсам актыўнага прыстасавання этнічных груп да сацыяльна-культурнага і прыроднага асяроддзя. Галоўным механізмам адаптацыі можна вызначыць прыняцце форм прадметнай дзейнасці і міжэтнічнага ўзаемадзеяння, норм і каштоўнасцей, што склаліся ў новым сацыяльна-этнічным асяроддзі.

Вучоныя вылучаюць актыўную і пасіўную формы адаптацыі. Пры актыўнай адаптацыі этнічная група ўздзейнічае на асяроддзе і змяняе яго. Пры пасіўнай форме, наадварот, этнічная група не імкнецца да ўздзеяння і змен. Паспяховая адаптацыя лепш за ўсё характарызуецца высокім узроўнем пражывання і псіхалагічнай задаволенасцю ў дадзенай сацыякультурнай прасторы.

Гістарычны кантэкст адаптацыі абумоўлены, па-першае, ходам гістарычных падзей, у выніку якіх складваліся адносіны паміж народамі, па-другое, падзеямі, якія набываюць сімвалічнае значэнне ў міжэтнічных кантактах, і асаблівасцямі гісторыка-сацыяльнага развіцця народаў, уключаных у кантакт.

Зыходзячы з нацыянальнага гісторыка-культурнага кантэксту, умоўна можна вылучыць шэсць перыядаў адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі.

Першы перыяд прыходзіцца на час існавання Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), калі першымі носьбітамі мусульманскай культурнай традыцыі на тэрыторыі беларускіх зямель былі татары. Звесткі аб іх паселішчах у ВКЛ датуюцца пачаткам XIV ст. Татары служылі ў войсках вялікіх князёў Гедыміна і Вітаўта. Кіраўнікі ВКЛ запрашалі прадстаўнікоў татарскай нацыянальнасці з Залатой Арды і Крыма, надзяляючы іх землямі, вызваляючы ад падаткаў і г. д. Частку татарскага насельніцтва на тэрыторыі ВКЛ складалі ваеннапалонныя падчас паходаў літоўскіх князёў. Акрамя таго, асобныя групы татараў добраахвотна перасяляліся ў Беларусь і Літву [1, с. 125]. Па некаторых гістарычных крыніцах, яшчэ ў часы князя Вітаўта колькасць татараў у арміі ВКЛ дасягала 40 тысяч чалавек [4, с. 36]. Калі гэта адпавядае рэчаіснасці, то можна меркаваць, што з улікам жанчын і дзяцей рэальная колькасць татараў-мусульман, якія пражывалі ў той перыяд на беларускіх землях, была істотна вялікая. У гістарычнай літаратуры прыводзяцца звесткі, што ў XVI ст. татараў у ВКЛ пражывала 100 тысяч чалавек [Там жа].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольшая колькасць татараў пасялілася на землях Беларусі і Літвы напрыканцы XIV – пачатку XV ст., асабліва пры княжанні Вітаўта (1392–1430), які дазволіў ім свабоду веравызнання, надзяліў зямлёй, цярпіма ставіўся да татарскіх абрадаў, звычаяў, мовы. Такім чынам былі створаны спрыяльныя ўмовы для іх сацыякультурнай адаптацыі. Таму нездарма ў татарскіх «Аль-Кітабах» вялікага князя ВКЛ Вітаўта называлі спадаром або апорай ісламу на Захадзе. Беларускія татары ў тыя далёкія часы маглі свабодна адкрываць свае малітоўныя дамы (мячэці), а «пажалаваныя» Вітаўтам і іншымі князямі землі перадаваліся, як правіла, у спадчыну [Там жа].

Такім чынам, у канцы XIV ст. жыхары беларускіх зямель набылі першы вопыт узаемадзеяння з носьбітамі ісламскай культурнай традыцыі.

Татарскія пасяленні ў XIV–XVI стст. узнікалі пераважна ў заходніх і цэнтральных частках Беларусі, ва ўсходняй Літве, прычым пражывалі татары найчасцей у гарадах і мястэчках. Асноўнымі цэнтрамі рассялення татараў у той час былі Клецк, Слуцк, Навагрудак, Мінск, Брэст, Ліда, Ашмяны і г. д. У гарадах татары жылі кампактнымі супольнасцямі на асобных вуліцах, у кварталах, назва якіх уключала слова «татарскія». Напрыклад, у Мінску існавалі «татарская слабада», «татарскі канец». Недастатковасць гістарычных крыніц не дае магчымасці высветліць дакладную колькасць татарскага насельніцтва ВКЛ у XIV–XVI стст.

Дзякуючы ісламскай культурнай традыцыі татары не толькі не растварыліся сярод славянскага насельніцтва, але аформіліся ў XVI ст. у адзіную этнічную групу, якая ўтварылася з прадстаўнікоў розных цюркскіх і мангольскіх плямён.

Важнейшым фактарам сацыякультурнай адаптацыі татараў было іх прававое становішча. Пачынаючы з XV ст. іх жыццядзейнасць рэгламентавалася шэрагам заканадаўчых дакументаў і прававых актаў. Спачатку гэта былі прывілеі вялікага князя, якія выдаваліся на права валодання зямлёй. Калі ваеннаслужачыя татары, якія мелі зямлю, і татары, што жылі ў гарадах і мястэчках, добраахвотна ішлі на вайну, яны ў сваіх правах прыраўноўваліся да шляхты, а іх надзелы вызваляліся ад падаткаў. У 1496 г. татарам нароўні са шляхтай было дадзена права на пастаяннае і неадʼемнае валоданне зямлёй. Яны мелі магчымасць набываць, прадаваць, абменьваць свае надзелы, але толькі са згоды вялікага князя.

Такім чынам, беларускія татары ў прававым становішчы прыраўноўваліся да шляхты. Выключэннем было тое, што яны не мелі права займаць дзяржаўныя пасады і прымаць удзел у пасяджэннях літоўскіх соймаў. Гэта не было сурʼёзным абмежаваннем для татараў, калі ўлічваць, што ў некаторых справах яны карысталіся самакіраваннем.

Другі перыяд сацыякультурнай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі звязаны з эпохай Рэчы Паспалітай (РП). Значным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактарам адаптацыі была свабода веравызнання і прыярытэт закону ў РП. Першым вынікам узаемадзеяння мусульман з карэннымі жыхарамі ў дадзены перыяд стала будаўніцтва мячэцей, якія на тэрыторыі беларускай дзяржавы з'явіліся яшчэ пры князю Вітаўту (у Некрашунцы пад Лідай, у Лоўчыцах пад Навагрудкам і г. д.). У XVI ст. іх разам з малітоўнымі дамамі налічвалася 200 [2, с. 163]. Мячэці сталі неад'емнай часткай беларускай драўлянай архітэктуры. У храме мусульман у самым сканцэнтраваным выглядзе прадстаўлена адметнасць этнасу. Тут яна захавалася найбольш некранутай на працягу стагоддзяў. Мячэць была не проста сакральным будынкам, але і сімвалам рэлігійнай традыцыі. У храме можна зразумець душу народа, бо праз калектыўнае дзеянне адбываецца асабістае спасціжэнне духоўных каштоўнасцей, асваенне культурнай прасторы, у якой чалавек адчувае сваю радавую чалавечую сутнасць і ў той жа час застаецца самастойным суб'ектам жыццядзейнасці.

У гэты перыяд у вербальнай культуры можна прасачыць прыклады мусульманска-хрысціянскага дыялогу. Многія цюрка-татарскія словы ўжываліся беларускім насельніцтвам і сталі часткай беларускай мовы. Але ў дачыненні да іх неабходна зрабіць заўвагу: некаторыя з гэтых слоў, магчыма, запазычаны беларусамі не непасрэдна ў татараў, а, можа, праз рускіх ці ўкраінцаў, у мовах якіх доля татарскіх слоў наогул вельмі значная.

Мова як вербальны сродак камунікацыі з'яўляецца ядром культуры. Праз мову чалавек засвойвае ўсё тое, што вызначае яго карціну свету: каштоўнасці, прадстаўленні, ацэнкі і інш. У XIV–XVII стст. ішоў працэс інтэнсіўнага выцяснення з сацыяльна-эканамічнага і ваеннага жыцця цюркскай мовы, замены яе старабеларускай. Асноўнымі прычынамі моўнай асіміляцыі былі: палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, удзел татараў у воінскіх фарміраваннях, сацыяльная дыферэнцыяцыя, змешаныя шлюбы мусульман з хрысціянкамі, ізаляванасць ад роднага краю. Менавіта ў гэты перыяд узнікла традыцыя беларускіх татараў запісваць свае святыя кнігі па-беларуску з выкарыстаннем арабскай графікі.

Нягледзячы на гэта можна сцвярджаць, што да XVI ст. адбылася амаль поўная сацыяльная, прававая і значная культурная інтэграцыя татараў. Але іслам стаў магутным фактарам, які дазволіў беларускім татарам захаваць этнічную ідэнтычнасць.

У эпоху Контррэфармацыі ў РП узмацнілася рэлігійная нецярпімасць, прыхільнікі ісламу адчулі разнастайныя формы прыгнёту і ганенні. Вынікам стала рэзкае скарачэнне колькасці татарскага насельніцтва на беларускіх землях. Гэта адбылося дзякуючы абмежавальным мерапрыемствам улад РП. Назіраўся значны пераход татараў-мусульман у хрысціянскія канфесіі. Ён прывёў да вельмі хуткага растварэння мусульман у асяроддзі хрысціянскай беларуска-польскай шляхты і поўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страты нацыянальных асаблівасцей. У выніку колькасць татараў-мусульман на землях РП скарацілася да 30 тысяч чалавек. Адбываўся працэс скарачэння прысутнасці ісламу ў беларускай сацыякультурнай прасторы.

Трэці перыяд адаптацыі звязаны з грамадска-палітычнымі зменамі, якія прывялі да трох падзелаў РП і ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. У 1795 г. на былых тэрыторыях ВКЛ налічвалася 23 мячэці і 65 малітоўных дамоў, што было істотна менш, чым за 200 гадоў да таго [Там жа, с. 164]. Пастуова скарачалася і колькасць мусульман – у 1897 г. на тэрыторыі губерняў, якія раней уваходзілі ў склад ВКЛ, іх налічвалася толькі 13 877 чалавек [Там жа, с. 139–140].

Пачынаючы з XIX ст. на беларускіх землях сталі з'яўляцца новыя пасяленцы-мусульмане, пераважна паволжскія татары, якія прыбылі сюды ў складзе дыслакаваных расійскіх вайсковых фарміраванняў [3]. У гэты час былі выпадкі заключэння шлюбаў паміж беларускімі татарамі і дзяўчатамі азербайджанскага і турэцкага паходжання [2, с. 140]. Пра колькасць такіх перасяленцаў меркаваць цяжка, можна толькі сцвярджаць, што іх было няшмат і агульную этнічную і культурную карціну беларускіх мусульман яны не змянялі.

Чацвёрты перыяд сацыякультурнай адаптацыі мусульман звязаны з Першай сусветнай вайной і наступнымі гістарычнымі падзеямі, у выніку якіх тэрыторыя Беларусі была падзелена паміж Польскай дзяржавай і Савецкім Саюзам. Большая частка мусульман апынулася на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. У Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. налічвалася толькі 3777 татараў-мусульман [Там жа, с. 145].

З прычыны атэістычнага характару палітыкі савецкай улады ў дачыненні да рэлігійных канфесій, культурна-рэлігійнае жыццё беларускіх мусульман было непрыкметнае. Пераважная большасць татараў-мусульман пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тут у сярэдзіне 1920-х гг. налічвалася 19 мусульманскіх абшчын. Назіралася тэндэнцыя кансалідацыі мусульманскай супольнасці. У 1929 г. быў адкрыты татарскі нацыянальны музей, у 1931 – татарскі архіў [Там жа, с. 143].

Пяты перыяд абумоўлены сацыяльна-палітычнымі падзеямі, у выніку якіх Заходняя Беларусь была далучана да БССР. Калі ў 1939 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі 17 мячэцей і 2 малітоўныя дамы, то на тэрыторыі БССР ужо не існавала ні адной мячэці. Пасля Другой сусветнай вайны разбурэнне культурнай прасторы беларускіх мусульман працягвалася.

Шосты перыяд, распачаты ў 1980-я гг. на хвалі адраджэння нацыянальнай беларускай культуры, звязаны з аднаўленнем ісламскіх традыцый у Беларусі. У 1989 г. створаны культурныя аб'яднанні «Аль-Кітаб» у Гродне і Мінску. Выдаваліся часопісы «Байрам» (1991–2002), «Аль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Джыхад» (1994–1997), «Жыццё» (1996–2002) і інш. Аднавілася дзейнасць мусульманскіх суполак у месцах кампактнага пражывання мусульман у найбуйнейшых гарадах: у Гродне з’явіліся татарскае грамадска-культурнае аб’яднанне «Кітаб» (1989), аб’яднанне чувашоў «Атал» (2007); у Магілёве – грамадскае аб’яднанне «Азербайджанская абшчына “Азёры”» (2004); у Мінску – грамадскія аб’яднанні «Дыялог Еўразіі» (1997) і «Сірыйская абшчына» (1997), Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны «Чышма» (1998), Міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя «Афганская абшчына» (1998), аб’яднанне «Габустан» (1989), міжнародныя грамадскія аб’яднанні казахаў «Елімай» (1999), дагестанцаў «Ачаг» (2002) і «Гора» (2007), «Кангрэс азербайджанскіх абшчын» (2003), «Палясцінская абшчына» (2004), мясцовы культурна-асветніцкі фонд «Бахар» (2010). З 2010 г. у Мінску ў БДПУ дзейнічае Цэнтр азербайджанскай мовы і культуры.

Пры правядзенні перапісу насельніцтва ў 2009 г. рэспандэнтам не задавалася пытанне аб адносінах да рэлігіі, аднак на падставе этнічнага складу краіны, бачнага па выніках гэтага перапісу, іслам у краіне вызнаюць каля 30 000 чалавек. Згодна з перапісам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пражывае каля 27 народаў, якія вызнаюць іслам: татары (7316), азербайджанцы (5567), туркмены (2685), узбекі (1593), казахі (1355), таджыкі (871), башкіры (607), туркі (469), афганцы (429), чачэнцы (265), аварцы (149), абхазы (98), кіргізы (95), даргінцы (88), караімы (20) і інш. [5].

Такім чынам, неабходна адзначыць сталы вопыт шасцісотгадовай прысутнасці ісламу на беларускіх землях. Перыяды сацыякультурнай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі цесна звязаны з гісторыка-культурным кантэкстам беларускіх зямель. Культурнае ўзаемадзеянне мусульман з карэнным насельніцтвам у большасці выпадкаў насіла і носіць мірны характар. Нягледзячы на істотную страту многіх культурных адрозненняў (мова, запазычанне стылю адзення, манер паводзін, дваранскай этыкі і каштоўнаснай сістэмы мясцовага насельніцтва), мусульмане ніколі цалкам не зліваліся з мясцовым насельніцтвам. Мусульманская культурная традыцыя аб’ядноўвае іх, дзякуючы чаму яны захоўваюць сваю этнічную супольнасць. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічаюць 8 мячэцей: у гарадах Іўе, Клецк, Маладзечна, Мінск, Навагрудак, Слонім, г. п. Смілавічы, в. Лоўчыцы. Мячэць як сімвал культуры выконвае не толькі функцыю захавання, але і трансляцыі культуры беларускіх мусульман.

1. *Дубянецкі, С.* Татары на Беларусі: рассяленне, становішча і адносіны з беларусамі / С. Дубянецкі // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі : матэрыялы Другой міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19–29 мая 1995 г. / рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 125–130.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Думін, С. У.* Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 206 с.

3. *Канапацкі, І. Б.* Гісторыя і культура беларускіх татар : вучэб. дапам. / І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік. – Мінск : БДУКМ, 2000. – 259 с.

4. *Канапацкая, З. И.* Татары в Беларуси и их культура (XIV–XVII века) : дис. ... канд. ист. наук : 08.04.05 / З. И. Канапацкая. – Минск, 2005. – 134 с.

5. Перепись населения 2009 : стат. сб. : в 3 т. / Нац. стат. ком. Респ. Беларусь ; редкол.: В. И. Зиновский (пред.) [и др.]. – Минск : Информ.-вычисл. центр Нац. стат. ком. Респ. Беларусь, 2011. – Т. 3 : Национальный состав населения Респ. Беларусь. – 433 с.

6. *Сорокин, П. А.* Этнографические этюды : сб. этногр. ст. / П. А. Сорокин. – Сыктывкар : Коми кн. изд-во, 1999. – 125 с.

7. *Тард, Г.* Законы подражания : пер. с фр. / Г. Тард. – М. : Книга по Требованию, 2012. – 378 с.

8. *Фернхем, А.* Личность и социальное поведение / А. Фернхем, П. Хейвен. – СПб. : Питер, 2001. – 358 с.

9. *Bochner, S.* Overseas students in Australia / edited by S. Bochner and P. Wicks. – Randwick, NSW : New South Wales University Press, 1972. – 244 p.

10. *Herskovits, M. J.* Les bases de L'antropologie culturelle / M. J. Herskovits. – Paris : Payot, 1967. – 163 p.

11. *Park, R. E.* Race and Culture / R. E. Park. – Glencoe : Free Press, 1950. – 403 p.

12. *Parsons, T.* The Social System / T. Parsons. – N. Y. : Free Press, 1951. – 575 p.

13. *Redfield, R.* Memorandum for the Study of Acculturation / R. Redfield, R. Linton, M. J. Herskovits // American Antropologist, 1936. – Vol. 38. – № 1. – P. 149–152.

14. *Redfield, R.* Peasant Society and culture : an Anthropological Approach to Civilisation / R. Redfield. – Chicago : The University of Chicago Press, 1956. – 163 p.

*M. Tatarevich*

**Cultural and historical context of the Muslims' adaptation on the Belarusian lands**

*Main periods of sociocultural adaptation of the carriers of the Muslim cultural tradition are conventionally designated, the experience of interaction with the Belarusians is summarized. The author pays attention to the cultural and historical context of the Muslims' adaptation to the social and cultural space of Belarus, finds its forms and distinctive elements that being absorbed in different value systems are able to maintain their own identity.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 07.06.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ